# ФІЛАЛОГІЯ

УДК 82.09:398.433 (417)

***І.В. Поўх***

*канд. філал. навук, дац. каф. замежных моў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: flk@brsu.brest.by

## ВОБРАЗЫ ЭЛЬФАЎ У ІРЛАНДСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

*Артыкул прысвечаны праблеме разнастайнасці і шматграннасці вобразаў эльфаў у ірландскім фальклоры. Аўтар разглядае гісторыю ўзнікнення тэрміна «эльф», міфаграфічныя і фалькларыстычныя тэорыі паходжання эльфаў, сацыяльны падзел іх грамадства, асяроддзе, лад жыцця і культуру, побыт, звычкі, звышнатуральныя здольнасці, паводзіны і маральныя каштоўнасці, стасункі паміж эльфамі і людзьмі. Асобна апісаны вобразы эльфаў (бан шы, лепрыкан, дула-хан і падменыш), паказаны найбольш тыповыя іх уласцівасці, згадваюцца мастацкія творы, у якіх сустракаюцца гэтыя вобразы.*

**Уводзіны**

У міфалогіі паняцце «эльф» зборнае і неадназначнае. У народных казках і павер'ях клас эльфаў нярэдка ахопліваў карлікаў, гоблінаў, фей і інш. Эльфы адказвалі за паводзіны стыхій: ветру, крыніц, лясоў, маглі станоўча ці адмоўна паўплываць на чалавечы лёс. Нярэдка дрэвы, узгоркі ці крыніцы, у якіх, па павер'ях, жылі эльфы, лічыліся свяшчэннымі.

Эльфы маглі дапамагаць збяднелым людзям у абмен на міску вяршкоў (валійскія казкі) ці лустачку хлеба з мёдам (англійскі фальклор), караць дрэнных людзей і ўзнагароджваць добрых. Яны маглі выкрадаць дарослых людзей ці дзяцей, асабліва немаўлят, і пакідаць замест іх так званыя пярэваратні.

Пасля прыходу хрысціянства эльфы ператварыліся ў свядомасці людзей у істот ніжэйшай міфалогіі, «нячыстую сілу», духаў. Узніклі хрысціянскія версіі іх паходжання, паводле якіх Бог скінуў з неба варожых анёлаў: самыя злыя накіраваліся разам з сатаной у пекла, а тыя, што знаходзіліся паміж дабром і злом, ператварыліся ў гномаў, эльфаў, фей, лепрыконаў, гоблінаў і іншых чароўных істот. У многіх хрысціянскіх крыніцах эльфы рэзка супрацьстаўляюцца Богу. Так, святы Колін, якога запрасіў кароль эльфаў, апырскаў усё вакол себя святой вадою, у выніку чаго раптам знік і замак эльфійскага караля, і ўся світа, і прыгожыя рыцары, і дзевы [1]. Акрамя святой вады, эльфы таксама баяцца царкоўных званоў. Малюсенькім эльфам-дурасліўцам народная традыцыя часта прыпісвае нелюбоў да святароў.

Мэта даследавання – прааналізаваць тыповыя характарыстыкі эльфаў як фальклорных персанажаў, вылучыць іх агульныя адметнасці і адрозненні паміж рознымі класамі, а таксама разгледзець найбольш пашыраныя вобразы эльфаў у ірландскіх казках і паданнях.

**Паходжанне эльфаў**

Эльфы – адна з найбольш пашыраных груп фантастычных істот, што займала цэнтральнае месца ў ірландскім фальклоры да XI ст. н.э., калі рымская каталіцкая царква ўсталявала сваю ўладу на тэрыторыі Ірландыі і прынесла новыя вобразы і сюжэты ў літаратуру.

Першапачаткова тэрмін «эльф» – *Fé erie* (ірл. *fairy* – 'вядзьмарства'), *Fées* (паходзіць ад *Fate* – 'лёс, наканаванне') – выкарыстоўваўся для абазначэння звышнатуральных істот, якія мелі ўплыў на жыццё людзей і прысутнічалі пры радзінах. Пазней ён быў пашыраны і распаўсюджаны на ўсіх зямных звышнатуральных істот, акрамя пачвар

і прывідаў. У Ірландыі эльфаў называюць *Aes Sídhe* (эйш шы). (Ірл. *Sídhe* – 'земляны насып, узгорак, холм', якіх шмат на тэрыторыі краіны). Як сцвярджаецца ў ірландскіх міфах і паданнях, *sídhe* жывуць пад узгоркамі, ад якіх і пайшла іх назва. Тым не менш даследчыкі сцвярджаюць, што тэрмін «*sídhe*» найперш павінен выкарыстоўвацца ў дачыненні да палацаў, замкаў і іншых месцаў, якія насялялі эльфы [8]. Таксама яны вядомы пад разнастайнымі назвамі («светлы народ», «добрыя суседзі», «маленькі народ», «мірныя людзі» і інш.), якія людзі прыдумалі, каб пазбегнуць непажаданай увагі да сябе і не абразіць іх.

Існуюць дзве асноўныя тэорыі паходжання эльфаў – фалькларыстычная і міфаграфічная. Фалькларыстычныя тэорыі сцвярджаюць, што эльфы – жывыя істоты, і імкнуцца апісаць іх паходжанне, а міфаграфічныя тэорыі зыходзяць з таго, што эльфаў насамрэч не існуе, і тлумачаць, чаму людзі іх прыдумалі. Усе фалькларыстычныя тэорыі складаюць тры асноўныя групы. Першая група ўяўляе эльфаў як анёлаў, якія пайшлі супраць Бога і былі вымушаны пакінуць нябёсы, але замест таго, каб сысці разам з сатаной у пекла, засталіся на зямлі. У другой групе эльфы – гэта душы нябожчыкаў, якія, з аднаго боку, не змаглі ўвайсці ў царства нябеснае, а з другога – награшылі не так многа, каб трапіць у пекла. Яны праходзяць чысцец, дзе нанова пражываюць жыццё. Трэцяя група называе эльфаў «дзецьмі Евы», якіх яна схавала ад Бога. У якасці пакарання Бог схаваў яе дзяцей ад яе самой і ад усіх людзей.

Міфаграфічныя тэорыі таксама паядноўваюцца ў тры групы. Згодна з першай, эльфы – старажытная чалавечая раса, што ў свой час была вымушана хавацца ад захопнікаў пад узгоркамі і забяспечвала сабе сродкі для існавання крадзяжом ежы, жывёл, нават жанчын і дзяцей. Эльфы рабавалі падарожнікаў, якія заходзяць у іх уладанні і адзіночныя фермы, дзе працуюць за ежу. Людзі, у сваю чаргу, пачалі прыпісваць ім звышнатуральныя здольнасці і ствараць уласныя рытуалы, каб абараніцца ад эльфаў і не сутыкацца з імі. Другая група ўяўляе эльфаў як элемент культа шанавання продкаў, асабліва тых, якія належалі да «залатой эпохі» гераічнага мінулага. Ірландскія казкі і паданні распавядаюць пра каралёў і герояў, якія траплялі ў краіну эльфаў пасля смерці і стваралі новыя каралеўствы пад узвышшамі і ўзгоркамі. Ірландцы верылі, што эльфы – гэта душы памерлых людзей, а іх краіна – жыццё пасля смерці. Нават пасля прыняцця хрысціянства на тэрыторыі Ірландыі было распаўсюджана павер'е, што душы памерлых чакаюць суднага дня пад ўзгоркамі эльфаў. Прыхільнікі трэцяй групы перш за ўсё інтэрпрэтуюць міфы і паданні і сцвярджаюць, што эльфы – гэта былыя богі, якіх пасля прыняцця хрысціянства ператварылі ў духаў прыроды. Згодна шматлікім ірландскім паданням і народным казкам, старажытныя плямёны Туаха дэ Данан і Фір Болг сышлі пад зямлю, пад узгоркі і ўзвышшы і сталі эльфамі [9].

**Грамадскі лад і культура эльфаў**

Незалежна ад свайго паходжання, эльфы маюць уласнае грамадства і культуру, як і людзі. Яны падзяляюцца на два асноўныя класы: эльфы, якія жывуць групамі (*Aes Sídhe, Tuatha Dé Danann, Fir Bholg* і інш.) і эльфы-адзіночкі (*Ban Sídh, Lepreacan*) [2; 6]. Калоніі эльфаў можна сустрэць пад узгоркамі або ў самой краіне эльфаў. Сацыяльны падзел іх грамадства вельмі падобны да людскога: у ім прысутнічаюць арыстакраты, або героі (*Daoine Sídhe*), шляхта (*Fir Bholg*) і сяляне (*Gruagacha*) [7]. Усе эльфы захапляюцца музыкай, нават адзіночкі і нядобрыя стварэнні. Яны выдатныя вершнікі, з задавальненнем прымаюць удзел ва ўрачыстых шэсцях як конна, так і пешшу. Мацнейшыя і прыгажэйшыя – арыстакраты. Як і ў людзей, у іх ёсць каралі і каралевы, рыцары і прыдворныя. Яны ладзяць балі і банкеты, гульні і спаборніцтвы. Найслабейшая група – сяляне, якія нагадваюць вясковых жыхароў. Шляхта займае прамежкавае становішча. Менавіта прадстаўнікі шляхты найчасцей узаемадзейнічаюць з людзьмі і нават маюць

агульнае з імі паходжанне. Шляхта і сяляне маглі жыць пад зямлёй і вадой, але пераважна яны насялялі зараснікі каля гарадоў і вёсак або нават могілкі.

Эльфы-адзіночкі жывуць пераважна ўдалечыні ад іншых, але раз-пораз збіраюцца на сход або кірмаш. Як правіла, яны не схільны да кантактаў з людзьмі, але адкрытую варожасць дэманструюць толькі злыя духі. У эльфаў-адзіночак адсутнічае фармальны сацыяльны падзел, але большасць з іх можна аднесці да шляхты або сялян, а некаторых нават да арыстакратаў. Яны не маюць уласнага жылля і могуць жыць дзе заўгодна. У сваю чаргу, эльфы-адзіночкі падзяляюцца на дзве падгрупы – дзікія і хатнія. Хатніх эльфаў-адзіночак можна сустрэць у дамах і надворных пабудовах, палях і садах або проста на людскіх надзелах. Дзікія эльфы-адзіночкі, незалежна ад сваіх памераў і характару, сустракаюцца ў прыродзе, насяляюць дрэвы і кветкі. Хатнія эльфы жывуць з людзьмі і дапамагаюць ім у працы, а дзікія – жывуць у прыродзе і бароняць яе ад умяшальніцтва чалавека. З іншага боку, ёсць хатнія эльфы, якія толькі перашкаджаюць людзям, і дзікія – дапамагаюць пасвіць жывёлу і збіраць ураджай [4].

Эльфы звычайна жывуць уласным, незалежным ад чалавека жыццём. Яны любяць музыку і танцы, у якіх значна пераўзыходзяць людзей, праводзяць спартыўныя спаборніцтвы і гульні, прадуць, ткуць, апрацоўваюць метал і скуру, шыюць вопратку і майструюць чоўны, гандлююць, працуюць у сваіх шахтах і вырошчваюць уласныя садавіну і гародніну, займаюцца паляваннем і вядуць войны. Эльфы трымаюць хатнюю гаспадарку (коней, сабак і буйную рагатую жывёлу) і выкарыстоўваюць розных дзікіх жывёл (аленей і коз). Тым не менш яны ўсё ж маюць залежнасць ад людзей: пра гэта сведчаць рэчы, якія крадуць або пазычаюць у іх, у прыватнасці зерне і іншыя прадукты харчавання [5].

**Звышнатуральныя здольнасці**

Эльфы, як звышнатуральныя істоты, маюць шматлікія здольнасці, якія залежаць ад іх сацыяльнага ўзроўню. Эльфы-героі карыстаюцца амаль бязмежнай уладай над часам і прасторай, а самыя маленькія феі-сяляне поўнасцю залежаць ад людзей, калі трапляюць да іх у палон. Нягледзячы на гэта, нават найслабейшыя эльфы могуць вельмі зашкодзіць чалавеку, калі іх раззлаваць, бо ўсе яны маюць здольнасць як зрабіць шчаслівым на ўсё жыццё чалавека, які ладзіць з імі або робіць ім паслугу, так і наслаць няшчасце на тых, кім яны незадаволены.

Усе эльфы маюць магічныя здольнасці. Яны здольны прымусіць чалавека бачыць тое, што патрэбна ім, альбо, наадварот, паказваюць тое, што павінна застацца незаўважаным. Эльфы-арыстакраты з дапамогай магіі ствараюць уласныя каралеўствы, у той час як найслабейшыя эльфы-сяляне могуць, па меншай меры, стаць нябачнымі. Эльфы блытаюць людзей, змяняючы знешні выгляд знаёмых ім мясцін і рэчаў або проста хаваючы іх. Большасць эльфаў могуць ператварацца ў што заўгодна, станавіцца велізнымі альбо маленькімі. Яны ўладараць над надвор’ем, могуць наслаць хваробу на чалавека або жывёлу, а таксама вылечыць іх, падымаць у паветра прадметы і будынкі, нават пазбаўляюць ежу пажыўных рэчываў [3].

Эльфы, якія жывуць групамі, здольны лётаць. Ім дапамагаюць у гэтым чароўныя словы і прылады, але некаторым дастаткова ўласнага жадання. Часам да гэтых палётаў далучаюцца і людзі, якіх эльфы скрадаюць, каб аднесці ў сваё каралеўства ці проста кінуць у нейкай далёкай краіне.

Пэўна, адна з асноўных магічных здольнасцей эльфаў – гэта ўплыў на ўрадлівасць. Шматлікія казкі і паданні распавядаюць пра бясконцы дабрабыт фермераў, якія шанавалі добрых суседзяў, а тыя, у сваю чаргу,назіралі за іх гаспадаркай, жывёлай і сям’ёй. Хто не шануе эльфаў, той пакутуе ад неўраджаю, хваробаў і крадзяжоў [5].

**Паводзіны і маральныя каштоўнасці эльфаў**

Паводзіны і маральныя каштоўнасці эльфаў, з аднаго боку, знаёмыя і лагічныя, з іншага – даволі нязвыклыя. Эльфы рэагуюць як на добрае, так і на дрэннае. Яны шчодра ўзнагароджваюць людзей нават за невялікія паслугі і жорстка караюць іх за нязначныя правіны. Тым не менш уяўленні эльфаў пра дабро і зло мала чым адрозніваюцца ад чалавечых: яны паважаюць і заахвочваюць добрасуседскія зносіны, шчодрасць, шчырасць, гасціннасць. Апошняя з'яўляецца найкаштоўнейшай якасцю ў вачах эльфаў, таму людзі запрашаюць іх да сябе, падтрымліваюць чысціню ў хаце і гаспадарчых пабудовах, агонь у каміне і нязменнае частаванне ў выглядзе сподачка з малаком, хлебам і сырам.

Даследчыкі вылучаюць два класы эльфаў у залежнасці ад іх маральных прынцыпаў – добры гурт і нядобры гурт. Эльфы, якія належаць да першага класа, могуць адпомсціць за крыўду, але прынцыповае адрозненне паміж імі заключаецца ў тым, што прадстаўнікі другой групы ніколі не робяць людзям добрага. Яны атрымліваюць найвялікшую асалоду ад шкоды, таму сябраваць з імі гэтак жа небяспечна, як і ваяваць. Людзі імкнуцца пазбягаць такіх эльфаў. У ірландскіх казках і паданнях эльфы нядобрага гурта прадстаўлены адзінай суполкай *Sluagh Sídhe* (Слуа Шы) – злыя духі, неадпетыя душы памерлых. Пры жыцці яны былі нядобрымі і распуснымі. Пасля смерці іх душы лётаюць па начах, скрадаюць неасцярожных падарожнікаў і прымушаюць іх забіваць людзей і жывёлу. Эльфы таксама займаюцца паляваннем на душы людзей, якія хутка памруць, каб далучыць іх да сваёй суполкі [2; 8].

Эльфы добрага гурта лагодна ставяцца да людзей, якія падпарадкоўваюцца іх законам. У якасці ўзнагароды чалавек атрымлівае ад іх бясконцыя прыпасы зерня і мукі, добрае здароўе і шанцаванне ва ўсім. Эльфы нават абараняюць іх ад небяспекі і смерці. Добрыя эльфы пераважна дабразычлівыя і справядлівыя, заўжды вяртаюць тое, што пазычылі. Нягледзячы на тое, што сярод сваіх эльфы заўжды строга прытрымліваюцца правіл паводзін, якія забараняюць несумленнасць і зладзейства, на людзей гэта не распаўсюджваецца. Эльфы таемна пазычаюць у іх зерне, малако і жывёлу. Яны скрадаюць нават саміх людзей – немаўлят, дзяцей, прыгожых жанчын. Немаўляты і дзеці трапляюць у каралеўства эльфаў найчасцей, таму што ім лягчэй за ўсё прывыкнуць да новага ладу жыцця. Часам замест скрадзенага дзіцяці эльфы пакідаюць калоду, але найчасцей – пярэваратня (падменыша). Падменыш – гэта эльф, які знешне выглядае гэтак жа, як і скрадзенае дзіця. Пярэваратнем можа быць нежыццяздольнае немаўля эльфаў альбо стары эльф, які ўжо занадта слабы, каб прыносіць карысць іншым [4].

Тым не менш эльфы вельмі злуюцца, калі людзі нешта бяруць у іх без дазволу. Яны бавяцца з людзьмі, але не дазваляюць ім жартаваць з сябе. Эльфы паважаюць прыватнасць. Яны жорстка караюць тых, хто нават выпадкова трапляе ў іх уладанні. Калі чалавек апынецца ў краіне эльфаў, у яго вельмі рэдка атрымліваецца выйсці адтуль жывым і здаровым. Часцей за ўсё гэта адбываецца, калі эльфы скрадаюць людзей, альбо чалавек робіць ім нейкую паслугу. Свае падарункі эльфы таксама робяць употай, а калі чалавек пачынае хваліцца імі, то губляе.

**Некаторыя віды ірландскіх эльфаў**

У ірландскім фальклоры прысутнічае шмат разнастайных эльфаў. Разгледзім найбольш распаўсюджаныя з іх.

***Ban Sídh (бан шы).*** Бан шы, жанчына каралеўства эльфаў, – прадвесніца хуткай смерці. Як сцвярджаюць паданні, яна з'яўляецца некаторым людзям, каб паведаміць пра надыход смерці. Яе апісваюць як жанчыну ў белай вопратцы са смяротна бледным тварам і белымі валасамі. Яна галосіць і можа быць апранута ў забруджаную крывёю вопратку будучага нябожчыка.

Лічыцца, што мала хто мае магчымасць бачыць бан шы. Даследчыкі згадваюць гісторыю шатландскага караля Якава I, да якога прыйшла жанчына і, галосячы, паведаміла, што ён хутка памрэ па загаду графа Атольскага ў 1437 г. Некаторыя паданні сцвярджаюць, што чалавек, які пачуў пранізлівы крык бан шы, памрэ на працягу сутак. Згодна з іншымі крыніцамі, памерці суджана блізкаму сваяку такога чалавека [2].

***Lepreacan (лепрыкан).*** Лепрыкан – адзін з найбольш вядомых эльфаў ірландскага фальклору. Ён належаць да зямных эльфаў-шаўцоў. Гэта вельмі маленькія, хударлявыя чалавечкі са зморшчаным тварам, хітрыя і шкодныя, ходзяць у зялёнай вопратцы і хаваюць скарбы. Калі чалавек здолее схапіць лепрыкана, то можа даведацца пра схаваныя скарбы; але эльфы вельмі разумныя і ніколі не дазволяць людзям забраць скарб. Так, у казцы «Рамонкавае поле» лепрыкан завязвае чырвоныя стужкі на ўсе рамонкі, каб чалавек не змог адшукаць той, пад якім схаваны скарб. Нягледзячы на такую агульнавядомасць, першыя згадкі пра лепрыканаў у англійскай літаратуры з’явіліся ў пачатку XVII ст.

***Púca (пука).*** Гэты маленькі эльф выклікае жах у людзей, калі з’яўляецца ноччу ў выглядзе разнастайных жудасных істот: кажана, арла, сабакі, казы або чорнага каня. Апоўначы ён знішчае жыта і палохае жывёлу, скарожвае малако і псуе рэчы. Яго паважаюць і баяцца за здольнасць чыніць шкоду і штогод імкнуцца задобрыць часткай ураджаю.

***Dullahan (дулахан).*** Гэты ірландскі эльф выклікае асацыяцыі з прывідам-вершнікам і найчасцей згадваецца ў графствах Сліга і Дон. Адсечаную галаву ён трымае пад пахай. Яна свеціцца, бы ліхтар, асвятляючы дулахану яго начны шлях. Як сцвярджаюць паданні, заглядаючы ў сваю галаву, дулахан здольны ўбачыць дом чалавека, які паміраe. Гэта злы дух, які прадракае смерць.

***Changelings (пярэваратні, падменышы).*** Паданні пра пярэваратняў шырока распаўсюджаны на тэрыторыі Еўропы, асабліва ў Ірландыі. Як адзначалася вышэй, пярэваратні – хворыя і нежыццяздольныя немаўляты эльфаў, якіх бацькі мяняюць на чалавечых дзяцей. Звычайна яны няздольны размаўляць або, наадварот, размаўляюць як дарослыя. Некаторыя падменышы заўжды галодныя і бесперастанна плачуць [9].

**Заключэнне**

Немагчыма ахапіць усю шматграннасць і разнастайнасць вобразаў эльфаў, прадстаўленых у ірландскім фальклоры. Многія з іх даволі супярэчлівыя і ў розных творах надзяляюцца супрацьлеглымі ўласцівасцямі. Не выклікае сумненняў адно: эльфы суправаджалі чалавека на працягу ўсяго жыцця, ад нараджэння да смерці, з’яўляліся неад’емнай часткай чалавечага побыту.

Даследаванне непарыўнай сувязі міфалогіі і побытавай культуры народа дапамагае лепш зразумець яго менталітэт і светапогляд, што, у сваю чаргу, садзейнічае пашырэнню міжкультурных сувязей і кантактаў паміж прадстаўнікамі розных нацый, павышэнню іх эфектыўнасці.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы лекцыйных курсаў і семінараў па замежнай літаратуры і фальклоры.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Fairies [Electronic resource] // Encyclopedia.com. The Gale Group. – Mode of access: https://www.encyclopedia.com/philosophy-and-religion/other-religious-beliefs-and-generalterms/-miscellaneous-religion/fairies. – Date of access: 03.09.2018.

2. Fairy and Folk Tales: The Trooping Fairies [Electronic resource] // Internet Sacred Text Archive. – Mode of access: http://www.sacred-texts.com/neu/yeats/fip/fip03.htm. – Date of access: 05.09.2018.

3. Irish Fairy Tales and Folk Tales and Fables [Electronic resource] // Vare Guide. Weider Media production. – Mode of access: https://fairytalez.com/region/irish/. – Date of access: 19.09.2018.

4. Irish Fairy Tales and Folk Tales [Electronic resource] // Ireland Calling. – Mode of access: https://ireland-calling.com/irish-fairy-stories-and-folk-tales/. – Date of access: 13.09.2018.

5. McKeon, M. A Guide to Irish Folk Tales [Electronic resource] / M. McKeon // Owlcaution. – Mode of access: https://owlcation.com/humanities/Guide-to-Irish-Fairy-Tales. – Date of access: 10.09.2018.

6. McKeon, M. Forgotten Fairies of Irish Folklore [Electronic resource] / M. McKeon // Owlcaution. – Mode of access: https://owlcation.com/humanities/Forgotten-Irish-Fairies?-utm_source=maven-coalition&utm_medium=hubpages&utm_campaign=liftigniter&utm_-con-tent=hp-related. – Date of access: 10.09.2018.

7. O'Brian, K. L. Supernatural Beings of Ireland [Electronic resource] / K. L. O'Brian // Medb hErenn Universe. – Mode of access: http://www.medbherenn.com/supernatural-beings-ireland.html. – Date of access: 12.09.2018.

8. O'Brian, K. L. The Faerie Lore of Ireland [Electronic resource] / K. L. O'Brian // Medb hErenn Universe. – Mode of access: http://www.medbherenn.com/faerie-lore.html. – Date of access: 10.09.2018.

9. World of Fairy [Electronic resource] // Fae Folk: The World of the Fae. – Mode of access: https://faefolk.weebly.com/lesson-3-1.html. – Date of access: 10.09.2018.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 12.11.2018

*Powkh I.V.* **Fairies of Irish Folklore**

*The article covers the diversity and complexity of fairy characters in Irish folklore. The author discusses the term «fairy», mythographic and folkloristic theories of their origin, fairies' society and habitations, everyday life and culture, habits, supernatural powers, morals and behaviour, relations between fairies and people. A special section is devoted to the most common fairy characters (ban sídh, lepreacan, púca, dullahan and changeling). The author describes their most typical characteristics with reference to the fairy-tales and stories that mention them.*